ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ**

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ И ПО ДЕЛАМ МОЛОДЁЖИ**

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

14.01.2022 № 9

г. Гомель

г. Гомель

Аб правядзенні абласнога агляду-конкурсу
XVI рэспубліканскага фестывалю народнай
творчасці ветэранскіх калектываў
"Не старэюць душой ветэраны"

З мэтай павышэння мастацкага ўзроўню, выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры ветэранскіх непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці, падтрымцы і актывізацыі творчасці людзей сталага ўзросту і арганізацыі іх вольнага часу
ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці абласны агляд-конкурс XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" (далей – абласны агляд-конкурс) у лютым 2022 года ў дыстанцыйным фармаце.

2. Зацвердзіць палажэнне, умовы і склад арганізацыйнага камітэта абласнога агляду-конкурсу (дадаткі 1, 2, 3).

3. Арганізацыю і правядзенне абласнога агляду-конкурсу ўскласці на ўстанову "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" (Сафрановіч Н.Д.).

4. Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога агляду-конкурсу ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2021-2025 гг.

5. Начальнікам аддзелаў (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў, Гомельскага гарвыканкама аказаць садзейнічанне ў арганізацыйным забеспячэнні ўдзелу калектываў у абласным аглядзе-конкурсе.

6. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы,

ГУ 0008454

Зак. 6555–3000.

культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Заўгародню І.С.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Д.У.Езерскі

Волкава 33 46 75

Дадатак 1

**Палажэнне**
аб правядзенні абласнога агляду-конкурсу XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" у дыстанцыйным фармаце

**Мэты абласнога конкурсу.**

Абласны агляд-конкурс XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" (далей – абласны агляд-конкурс) праводзіцца ў мэтах:

- героіка-патрыятычнага выхавання насельніцтва;
- далейшага развіцця і папулярызацыі традыцый аматарскай мастацкай творчасці;
- арганізацыі вольнага часу ветэранаў;
- павышэння мастацкага ўзроўню, выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры ветэранскіх непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці;
- узбагачэння рэпертуару аматарскіх калектываў лепшымі творамі песеннага мастацтва беларускіх аўтараў, айчыннай і сусветнай мастацкай культуры.

**Кіраўніцтва абласным конкурсам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога агляду-конкурсу ствараецца абласны аргкамітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці", Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў і абласнога савета Гомельскай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

У перыяд падрыхтоўкі абласнога агляду-конкурсу аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу абласнога агляду-конкурсу, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва абласным аглядам-конкурсам у тэрмін правядзення, уводзіць дадатковыя намінацыі.

Абласны агляд-конкурс праводзіцца дыстанцыйна.

Заяўкі на ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе, відэа з выступам у фармаце tiff і творчыя характарыстыкі ўдзельнікаў (разам з фотаздымкам у фармаце jpeg або jpg не менш 800x600 пікселяў) дасылаюцца да **10 лютага 2022 года** на электронны адрас ocnt6@mail.gomel.by, установа "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці", аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці" (форма заяўкі дадаецца).

На афіцыйным сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” да 15 лютага будзе размешчаны спіс удзельнікаў абласнога агляду-конкурсу.

Прагляд конкурсных праграм будзе ажыццяўляцца членамі журы з 21 па 26 лютага 2022 года.

**Падвядзенне вынікаў абласнога агляду-конкурсу і ўзнагароджванне.**

Журы будзе ўлічваць:

- узровень выканаўчага майстэрства;
- раскрыццё музычна-вобразнага зместу твораў;
- падбор конкурснай праграмы, наяўнасць твораў беларускай тэматыкі;
- касцюміраванне, сцэнічную культуру.

Па выніках прагляду відэа конкурсных выступленняў журы вызначае лаўрэата з уручэннем Гран-пры, дыплома і каштоўнага падарунка на суму ў памеры да 6 базавых велічынь; дыпламантаў I, II, III ступеняў у кожнай намінацыі абласнога агляду-конкурсу з уручэннем дыплома і каштоўнага падарунка: I ступені – на суму ў памеры да 5 базавых велічынь, II ступені – на суму ў памеры да 4 базавых велічынь; III ступені – на суму ў памеры да 3 базавых велічынь.

Аргкамітэт абласнога агляду-конкурсу прадугледжвае ўзнагароджванне дыпломамі і каштоўнымі падарункамі на суму ў памеры да 1 базавай велічыні ў намінацыях:

- “Памяць сэрца”;
- “Я люблю цябе, жыццё”;
- “Любай Беларусі”;
- “Грай, музыка”.

Астатнія калектывы ўзнагароджваюцца граматамі за ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе.

Пры неабходнасці журы астаўляе за сабой права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць намінацыі альбо ўвесці новыя. У выпадку непрысуджэння, раздзялення месцаў паміж удзельнікамі дапускаецца раздзяленне каштоўных падарункаў у межах прадугледжаных сродкаў.

Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Па выніках абласнога агляду-конкурсу выдаецца буклет.

Лепшыя выступленні калектываў, індывідуальных выканаўцаў будуць размешчаны на афіцыйным сайце і YouTube канале ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” пасля падвядзення вынікаў.

Па рашэнню журы абласнога агляду-конкурсу будзе адабраны адзін калектыў, які прадставіць Гомельскую вобласць у заключных мерапрыемствах XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" ў г. Мінску.

**Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога агляду-конкурсу ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2021-2025 гг.

Кантакты для вырашэння арганізацыйных пытанняў: (0232) 337302, +375(29)1818945, Хахракова Таццяна Уладзіміраўна, вядучы метадыст па культурна-дасугавай дзейнасці ўстановы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці".

Дадатак 2

**Умовы**
правядзення абласнога агляду-конкурсу
XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў “Не старэюць душой ветэраны”

Абласны агляд-конкурс праводзіцца ў лютым 2022 года дыстанцыйна.

**У абласным аглядзе-конкурсе прымаюць удзел хары, ансамблі ветэранаў вайны і працы з найменнем “народны” дзяржаўных і ведамасных клубных устаноў, а таксама асобныя выканаўцы не маладзей за 50 год.**

Конкурсныя выступленні праводзяцца па наступных намінацыях:
- хары ветэранаў вайны і працы;
- ансамблі ветэранаў вайны і працы;
- асобныя выканаўцы.

Харавыя калектывы, вакальныя ансамблі выконваюць два творы (пажадана, каб адзін з твораў быў прысвечаны святкаванню 77-й гадавіны з Дня Перамогі ў Вялікай Айчынай вайне), індывідуальныя выканаўцы – адзін твор.

Конкурсная праграма калектыву і індывідуальнага выканаўцы павінна быць прадстаўлена ва ўстанову “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на электронным носьбіце (флэш-карце) або на электронны адрас: ocnt6@mail.gomel.by.

Відэазапіс не павінен змяшчаць мантаж або спецэфекты. Запіс павінен быць зроблены на прафесійным абсталяванні або мабільным тэлефонам са штатыва ў высокай якасці без акустычных правалаў. Павінны адсутнічаць шумавыя гукі. Відэа можа быць знята ва ўмовах рэпетыцыйнай залы (сцэны). Абавязковай умовай для адпраўленых матэрыялаў з’яўляецца выразнасць малюнка і гуку.

Дадатак 3

**Склад арганізацыйнага камітэта**
абласнога агляду-конкурсу XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

| | |
|---|---|
| Езерскі Дзяніс Уладзіміравіч | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама |
| Няверaў Аляксей Мікалаевіч | старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў |
| Чарнаштан Уладзімір Сцяпанавіч | старшыня абласнога савета Гомельскай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў |
| Сафрановіч Наталля Дзмітрыеўна | дырэктар установы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" |

# ЗАЯЎКА

удзельніка дыстанцыйнага абласнога агляду-конкурсу XVI рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў “Не старэюць душой ветэраны”

________________________________(раён, горад)

1. Поўная назва калектыву, базавая прыналежнасць
2. Прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка, кантактны тэлефон
3. Намінацыя
4. Колькасць удзельнікаў
5. Творчая характарыстыка, не больш 1 старонкі, фота калектыву
6. Рэпертуар

| Аўтары твора | Назва твора | Прозвішча, імя і імя па бацьку саліста пры наяўнасці |
|---|---|---|
| | | |

Начальнік аддзела (упраўлення)
ідэалагічнай работы, культуры і
па справах моладзі райвыканкама,
Гомельскага гарвыканкама ________ ________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)